ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 36 (169) | Субота, 8 снежня 1973 г. | Газета выходзіць з верасня 1969 года раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## У ПАЛІТБЮРО ЦК КПСС, ПРЭЗІДЫУМЕ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР, САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ СССР

## Аб выніках візіту таварыша Л. І. Брэжнева ў Індыю

Палітбюро ЦК КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР, Савет Міністраў СССР разгледзелі вынікі афіцыйнага дружалюбнага візіту Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева ў Рэспубліку Індыя, поўнасцю адобрылі дзейнасць таварыша Л. І. Брэжнева па развіццю дружалюбных савецка-індыйскіх адносін, па ажыццяўленню прынятай XXIV з'ездам КПСС Праграмы міру. Візіт, які праходзіў у абстаноўцы масавай дэманстрацыі дружбы індыйскага народа да Савецкага Саюза, узняў савецка-індыйскія адносіны, што грунтуюцца на трывалай аснове Дагавору аб міры, дружбе і супрацоўніцтве паміж СССР і Індыяй, на больш высокую ступень.

Палітбюро ЦК КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР з вялікім задавальненнем адзначаюць важнае значэнне падпісаных у час візіту таварыша Л. І. Брэжнева ў Індыю дакументаў, якія даюць пэўны імпульс развіццю цесных дружалюбных адносін паміж дзвюма краінамі на карысць іх народаў. Асаблівае месца сярод іх займае цесная сумесная савецка-індыйская дэкларацыя. Значэнне гэтага дакумента заключаецца ў тым, што ён развівае асноўныя прынцыпы адносін паміж СССР і Індыяй і вызначае галоўны напрамак супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. Дэкларацыя была з вялікім адабрэннем сустрэта і ў Савецкім Саюзе, і ў Індыі, паколькі яна адпавядае карэнным інтарэсам народаў абедзвюх краін, з'яўляецца важным фактарам умацавання міру і бяспекі ў Азіі і ва ўсім свеце.

Вялікае значэнне мае падпісанае ў час візіту пагадненне аб далейшым развіцці эканамічнага і гандлёвага супрацоўніцтва паміж СССР і Індыяй, якое вызначае напрамак узаемавыгаднага плённага эканамічнага супрацоўніцтва на працяглы перыяд. Плённае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, заснаванае на прынцыпе роўнасці і ўзаемнай выгады, з'яўляецца важным фактарам як для эканомікі Савецкага Саюза, так і для ўмацавання эканамічнай самастойнасці Індыі, што ідзе па шляху нацыянальнага адраджэння і расшырэння сацыяльных пераўтварэнняў.

Палітбюро ЦК КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР, Савет Міністраў СССР высока ацэньваюць вынікі перагавораў таварыша Л. І. Брэжнева з І. Гандзі па міжнародных пытаннях. У ходзе гэтых перагавораў было пацверджана супадзенне поглядаў па шырокаму колу актуальных міжнародных праблем сучаснасці. Савецкі Саюз і Індыя пацвердзілі сваю рашучасць і надалей прыкладаць намаганні да разрадкі напружанасці, лічачы, што аздараўленне міжнароднага клімату можа і павінна даваць рэальны практычны плён усім краінам свету, вялікім і малым, развітым і тым, якія сталі на шлях развіцця. Савецкі Саюз і Індыя выказаліся ў карысць спынення гонкі ўзбраенняў, дасягнення ўсеагульнага і поўнага раззбраення, падрыхтоўкі сусветнай канферэнцыі па раззбраенню, а таксама за хутчэйшую і поўную ліквідацыю рэшткаў каланіялізму і расізму.

У ходзе перагавораў бакі з новай сілай падкрэслілі перакананасць у тым, што існуючыя ў Паўднёвай Азіі спрэчныя праблемы могуць і павінны вырашацца пры дапамозе перагавораў паміж зацікаўленымі краінамі без якога-небудзь умяшання звонку.

Палітбюро ЦК КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР з задавальненнем адзначаюць станоўчыя вынікі шырокага абмену думкамі, які адбыўся ў час перагавораў у Дэлі па праблемах Азіі. Савецкі Саюз, дзве трэці тэрыторыі якога размешчаны ў Азіі, і буйная азіяцкая дзяржава Індыя глыбока зацікаўлены ў захаванні міру і стабільнасці ў гэтым раёне, заснаваных на сумесных намаганнях азіяцкіх дзяржаў.

Вынікі візіту таварыша Л. І. Брэжнева ў Індыю цалкам і поўнасцю адпавядаюць выстаўленай красавіцкім Пленумам ЦК КПСС задачы — дабівацца таго, каб дасягнутыя спрыяльныя перамены ў міжнароднай абстаноўцы набылі незваротны характар.

Візіт таварыша Л. І. Брэжнева і яго вынікі атрымліваюць аднадушнае адабрэнне народаў Савецкага Саюза і Індыі, якія бачаць у ім яркую дэманстрацыю непарушнай савецка-індыйскай дружбы. Гэты візіт знаходзіцца ў цэнтры ўвагі міжнароднай грамадскасці, палітычных і дзяржаўных колаў многіх краін, ён выклікаў шырокі станоўчы водгук, адабрэнне і падтрымку.

Высока ацэньваючы вынікі візіту таварыша Л. І. Брэжнева ў Індыю, Палітбюро ЦК КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР зноў пацвярджаюць, што Савецкі Саюз будзе ісці шляхам, намечаным Праграмай міру, прынятай на XXIV з'ездзе КПСС. Савецкі Саюз будзе і надалей абапірацца на брацкія дружбу і супрацоўніцтва з сацыялістычнымі краінамі, развіваць адносіны з усімі міралюбівымі дзяржавамі.

## ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ СПАБОРНІЦТВА

Трэцяга снежня адбылося сумеснае пасяджэнне рэктарата, парткома і мясцовага камітэта па падвядзенню вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва паміж факультэтамі, кафедрамі і іншымі падраздзяленнямі ўніверсітэта. Па гэтаму пытанню выступіў намеснік старшыні мясцкома, старшыня вытворчай камісіі прафесар А. С. Калугін, які прааналізаваў тыя дасягненні, якіх дабіўся калектыў ГДУ ў трэцім, рашаючым годзе дзевятай пяцігодкі. Дакладчык адзначыў павышэнне паспяховасці студэнтаў, развіццё іх навукова-даследчай работы, плённую працу студэнцкіх будаўнічых атрадаў, гаварыў пра іншыя паказчыкі, якія ўлічваліся пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва і вызначэнні яго пераможцаў.

Пасля падвядзення вынікаў першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве прысуджана эканамічнаму факультэту, кафедрам палітэканоміі, беларускай літаратуры і грамадзянскай абароны, бібліятэцы; другое месца — гісторыка-філалагічнаму факультэту, кафедрам гісторыі КПСС і навуковага камунізму, рускай і беларускай моў, фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны, алгебры і геаметрыі, вучэбнаму корпусу № 1, трэцяе — механіка-матэматычнаму факультэту, кафедрам тэарэтычнай фізікі, педагогікі і псіхалогіі, фізіялогіі чалавека і жывёлы, інтэрнату № 2.

Затым на сумесным пасяджэнні было заслухана і абмеркавана пытанне аб стане ва ўніверсітэце грамадзянскай абароны. З дакладам выступіў начальнік штаба ГА Р. С. Мільчанка.

Выступіў загадчык кафедры грамадзянскай абароны дацэнт Ф. Ф. Ганчэль. Ён гаварыў аб неадкладнай неабходнасці паляпшэння ўмоў для работы гэтай кафедры, аб павышэнні патрабаванняў да студэнтаў у вывучэнні курса грамадзянскай абароны. Фелікс Феліксавіч прывёў шэраг прыкладаў, якія сведчаць аб шматлікіх пропусках заняткаў па гэтай дысцыпліне (асабліва на факультэце фізвыхавання) і непрыняцці мер да прагульшчыкаў.

Прынята пастанова, якая накіравана на карэннае паляпшэнне работы па грамадзянскай абароне і больш паспяховаму вывучэнню гэтага курса студэнтамі. З тымі, хто будзе без уважлівых прычын прапускаць заняткі, вырашана прымяняць самыя строгія меры ўздзеяння аж да выключэння з універсітэта.

На сумесным пасяджэнні рэктарата, парткома і мясцовага камітэта заключана працоўнае пагадненне па ахове працы.

## ПЕРАМОЖЦАМ УРУЧАНЫ ЎЗНАГАРОДЫ

У мінулы аўторак ва ўніверсітэце адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны Дню Канстытуцыі СССР і ўручэнню ўзнагарод пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва трэцяга, рашаючага года дзевятай пяцігодкі.

Вечар адкрыў сакратар парткома У. В. Казлоў. Ён прадаставіў слова старшыні мясцовага камітэта Ф. Ф. Ганчэлю. Фелікс Феліксавіч горача павіншаваў прысутных з усенародным святам — Днём Канстытуцыі СССР і паведаміў аб выніках сацыялістычнага спаборніцтва, падведзеных на сумесным пасяджэнні рэктарата, парткома і мясцкома.

Пераможцу спаборніцтва — эканамічнаму факультэту — уручан пераходны Чырвоны сцяг і Ганаровая грамата. Калектывам іншых падраздзяленняў, якія заваявалі першае месца, уручаны пераходныя чырвоныя вымпелы і Ганаровыя граматы. Тыя калектывы, якім па выніках спаборніцтва прысуджаны другія і трэція месцы, узнагароджаны Ганаровымі граматамі.

Для ўдзельнікаў вечара быў паказан мастацкі кінафільм.



**Гэты здымак быў зроблены на 1-ай навукова-метадычнай канферэнцыі па актуальных пытаннях вышэйшай адукацыі. На секцыі выкладання грамадскіх дысцыплін з дакладам «Аб методыцы чытання лекцый па палітычнай эканоміі на аддзяленні завочнага навучання» выступіў дацэнт, загадчык кафедры палітэканоміі М. М. Маёраў. Пад яго кіраўніцтвам кафедра праводзіць вялікую навуковую і метадычную работу, дабілася высокай паспяховасці студэнтаў па палітычнай эканоміі, сёлета заваявала першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве кафедр універсітэта.**

Фота А. Рудчанкі.

## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

Пазаўчора адбылося чарговае пасяджэнне Вучонага савета ўніверсітэта. Першым на парадку дня стаяла пытанне аб укараненні навукова-даследчай работы студэнтаў у вучэбны працэс, па якому заслухан даклад навуковага кіраўніка СНТ прафесара А. С. Калугіна. Асноўную ўвагу ён звярнуў на паляпшэнне арганізацыі вучэбна-даследчай работы студэнтаў як на адзін з важнейшых элементаў універсітэцкай сістэмы адукацыі і ідэйна-палітычнага выхавання маладых спецыялістаў, на неабходнасць распрацоўкі палажэння аб ВДР. Пры гэтым, зазначыў А. С. Калугін, ВДР не павінна дубліраваць добраахвотную студэнцкую работу ў сістэме СНТ.

Значнае месца дакладчык удзяліў пытанню арганізацыі і відам вучэбных даследаванняў на ўсіх факультэтах I—IV курсаў. Трэба дабіцца такога становішча, сказаў у заключэнне А. С. Калугін, каб дыпломныя работы выпускнікоў універсітэта насілі навукова-даследчы характар, з'яўляліся важнейшым і вышэйшым элементам ВДР.

На Вучоным савеце заслуханы паведамленні в. а. дэкана фізічнага факультэта У. М. Старыкава і дэкана геалагічнага факультэта Ю. Ф. Хадакоўскага аб стане вучэбна-выхаваўчай работы на першых курсах гэтых факультэтаў.

Па абмеркаваных пытаннях прыняты адпаведныя пастановы.

На Вучоным савеце разгледжаны рэкамендацыі аб прысваенні вучоных званняў.

## У КАМІТЭЦЕ КАМСАМОЛА

Адбылося чарговае пасяджэнне бюро камітэта камсамола, на якім заслухана выступленне намесніка сакратара камітэта ЛКСМБ па вучэбна-навуковай рабоце Яўгена Бабічава аб ходзе ва ўніверсітэце V Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху.

Зацверджан новы састаў штаба працоўных спраў, у які ўвайшлі У. Дзюбо, М. Бордак, А. Шчэрба, В. Парыч, У. Дашкевіч, Н. Пяцяры, П. Петрашэнка, А. Радзіёнаў, Р. Дуб, Т. Лукашова, С. Шалухін.

Камітэт камсамола выдаў рэкамендацыі А. Бабіну, С. Лаўрыненку і В. Іванову для ўступлення кандыдатамі ў члены КПСС.

# ПАЛАЖЭННЕ

## АБ АГЛЯДЗЕ-КОНКУРСЕ СТУДЭНЦКІХ ІНТЭРНАТАЎ, ПРЫСВЕЧАНЫМ 50-ГОДДЗЮ ПРЫСВАЕННЯ КАМСАМОЛУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

### І. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ

а) Паляпшэнне палітыка-выхаваўчай работы ў студэнцкіх інтэрнатах.

б) Стварэнне лепшых жыллёва-бытавых умоў студэнтаў.

в) Паляпшэнне санітарнага стану.

г) Выхаванне беражных адносін да сацыялістычнай маёмасці.

д) Арганізацыя здаровага рэжыму, працы і актыўнага адпачынку студэнтаў.

е) Развіццё ў студэнтаў ініцыятывы і самастойнасці, выхаванне адказнасці за даручаную справу, высокай культуры паводзін.

### II. АРГАНІЗАЦЫЯ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ

Агляд-конкурс праводзіцца рэктаратам, парткомам, камітэтам камсамола і прафкомам да 20 мая 1974 года. Адказнасць за выкананне ўмоў конкурсу ўскладваецца на дэканаты, камендантаў, студэнцкія саветы, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі факультэтаў.

### III. УМОВЫ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ

Пераможцам агляду-конкурсу лічыцца калектыў студэнцкага інтэрната, які праявіць высокую арганізаванасць, актыўнасць у палітыка-выхаваўчай, культурна-масавай і спартыўнай рабоце, выканае патрабаванні, прадугледжаныя ў адносінах да інтэрната, і набярэ найбольшую колькасць балаў.

### IV. ПАТРАБАВАННІ ДА ЎТРЫМАННЯ ІНТЭРНАТАЎ

**1. Ленінскі пакой:**

а) Павінен мець наглядную агітацыю, прысвечаную выкананню рашэнняў XXIV з'езда КПСС і па дастойнай сустрэчы 50-годдзя прысваення камсамолу імя У. І. Леніна.

б) Неабходна весці падшыўкі газет, мець настольныя гульні.

в) Не дапусціць выпадкаў паломкі мэблі.

**2. Чытальная зала:**

а) Наяўнасць несапсаванай мэблі.

б) Сістэматычнае дзяжурства.

**3. Жыллёвыя пакоі:**

а) Жыллёвыя пакоі павінны ўтрымлівацца ў чысціні, мець несапсаваную мэблю. Пражываючыя ў інтэрнаце абавязаны строга захоўваць правілы ўнутранага распарадку.

б) Умывальнікі, санвузлы, кубавыя-кухні, пральні, душавыя павінны ўтрымлівацца ва ўзорнай чысціні.

в) Калідоры і холы на паверхах павінны быць афармлены нагляднай агітацыяй, якая адлюстроўвала б палітыка - выхаваўчую, культурна-масавую і спартыўную работу студэнтаў факультэта.

г) На кожным паверсе мець аформленыя экраны санітарнага стану пакояў, графікі дзяжурстваў, насценныя газеты, у тым ліку сатырычныя.

### V. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ

Папярэднія вынікі агляду-конкурсу будуць падведзены на пашыраным пасяджэнні конкурснай камісіі 30 снежня 1973 г., а канчатковыя — да 20 мая 1974 г.

Лепшаму інтэрнату будзе ўручан пераходны Чырвоны сцяг і грамата рэктарата, парткома, камітэта камсамола і прафкома. Для актыву гэтага інтэрната арганізуецца турысцкая паездка ў Маскву або Ленінград.

Інтэрнату, які зойме другое месца, уручаецца пераходны вымпел і грамата.

### САСТАЎ КОНКУРСНАЙ КАМІСІІ:

ДЗЯДЗІЧКІН В. П. — кандыдат медыцынскіх навук, старшыня конкурснай камісіі.

ЛЯВОНЧАНКА Д. А. — прарэктар па вучэбнай рабоце.

КОНУХАЎ В. І. — в. а. прарэктара па адміністратыўна-гаспадарчай рабоце.

ІЛЬЯНКОВА Т. І. — сакратар камітэта камсамола.

ЛЯЛЬКОВА Я. А. — нам. сакратара камітэта камсамола.

СТАРАВОЙТАЎ М. І. — старшыня прафкома.

БАЛОГА У. П. — рэдактар шматтыражнай газеты «Гомельскі ўніверсітэт».

АКСЁНАВА М. І. — старшыня студсавета інтэрната № 2.

ВАРАБ'ЁЎ У. В. — старшыня студсавета інтэрната № 1.

МАЛАХАВА М. І. — старшыня прафбюро механіка-матэматычнага факультэта.

ПУЗАНАВА Л. М. — член камісіі парткома па рабоце ў студэнцкіх інтэрнатах.

## ЗІМОВАЙ СЕСІІ — ВЫДАТНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ!



**У студэнцкім жыцці чытальная зала бібліятэкі — своеасаблівы барометр. Цяпер ён паказвае на тое, што хутка пачнецца зімовая залікова-экзаменацыйная сесія. Калі б ні зайшоў у «чыталку» — днём ці вечарам — тут рэдка бываюць свабодныя месцы. Студэнты ўседліва вывучаюць праграмныя матэрыялы, каб не спасаваць на экзаменах.**

**НА ЗДЫМКУ:** у чытальнай зале ўніверсітэта.

Фота А. РУДЧАНКІ.

□

## У ВНУ КРАІНЫ

Студэнцкі клуб Ленінградскага політэхнічнага інстытута імя М. І. Калініна распрацаваў спецыяльную праграму для студэнтаў-першакурснікаў, якая будзе знаёміць з гісторыяй Ленінграда. Гораду на Няве, як вядома, споўнілася 270 год. Лекцыі і экскурсіі пазнаёмяць з выдатнымі гістарычнымі і архітэктурнымі помнікамі, рэвалюцыйнымі, баявымі і працоўнымі традыцыямі горада, са скарбніцай свету — Эрмітажам.

Цыкл лекцый «Моладзь у сучасным свеце» мае на ўвазе сустрэчы з ленінградскімі філосафамі, сацыёлагамі, якія раскажуць аб праблемах савецкай і замежнай моладзі.

(**«Политехники», г. Ленінград**).

●

Навукова-даследчаму эканамічнаму інстытуту Варонежскага дзяржаўнага ўніверсітэта споўнілася 10 год. За гэтыя гады інстытут вырас у буйную навуковую ўстанову. Аб'ём яго даследаванняў у гэтым годзе — звыш 750 тысяч рублёў. У складзе інстытута — галіновыя лабараторыі Міністэрства машынабудавання для лёгкай і харчовай прамысловасці і бытавых прыбораў СССР і Міністэрства харчовай прамысловасці РСФСР, падраздзяленні, якія заняты выкананнем заданняў Дзяржплана РСФСР, а ў апошнія два гады — і эканомікай вышэйшай адукацыі.

(**«Воронежский университет»**).

●

Тры гады існуе ва ўніверсітэце факультэт прыкладной матэматыкі. Ён быў створаны на базе кафедраў вылічальнай матэматыкі, дыферэнцыяльных ураўненняў і прыкладной матэматыкі матэматычнага факультэта і новых — ураўненняў матэматычнай фізікі і матэматычнага забеспячэння ЭВМ. У гэтым навучальным годзе створана кафедра агульнага праграмавання. Большасць супрацоўнікаў кафедры — гэта выпускнікі матэматычнага факультэта і факультэта прыкладной матэматыкі апошніх гадоў.

(**«Беларускі універсітэт»**).

●

У зале сярэдняй школы № 1140 г. Масквы — «базавай» школы мастацка-графічнага факультэта Маскоўскага педагагічнага інстытута імя У. І. Леніна — з вялікім поспехам прайшла персанальная выстаўка твораў загадчыка кафедры жывапісу А. С. Пірагова.

(**«Ленинец»**).



**У студэнтаў выпускных курсаў універсітэта цяпер цікавая і адказная пара — пераддыпломная практыка. У час яе праходжання трэба паказаць усё тое, на што ты здольны, які маеш запас тэарэтычных ведаў.**

**На гэтым здымку вы бачыце выпускніцу біёлага-глебавага факультэта Галіну Гаўрыленка. Яна дае самастойны ўрок у адным з класаў СШ № 40 г. Гомеля.**

## СУСТРЭЧА З ГЕРОЕМ

На гэтым тыдні госцем студэнтаў, якія жывуць у інтэрнаце № 1, быў Герой Савецкага Саюза, падпалкоўнік запасу, былы настаўнік-інструктар першага ў свеце касманаўта Ю. А. Гагарына Р. К. Дзенісенка. Усе, хто сабраўся ў ленінскім пакоі, з захапленнем слухалі расказ ветэрана Вялікай Айчыннай вайны аб барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў за вызваленне Радзімы, а таксама пра тое, якім выдатным чалавекам быў піянер касмічных падарожжаў Юрый Аляксеевіч Гагарын.

Студэнты шчыра падзякавалі Р. К. Дзенісенку за яго вельмі цікавыя ўспаміны.

## НА ПАСЯДЖЭННІ ЛІТАБ'ЯДНАННЯ

У канцы лістапада адбылося чарговае пасяджэнне літаратурнага аб'яднання «Росквіт», якое створана пры рэдакцыі нашай шматтыражнай газеты. Свае новыя творы чыталі маладыя аўтары, якія спрабуюць сілы ў паэзіі і прозе. З крытычнымі заўвагамі выступілі Сямён Шыкун, Аляксандр Дуброўскі і іншыя таварышы.

Пасяджэнне літаб'яднання прайшло вельмі цікава і з вялікай карысцю для тых, хто хоча па-сапраўднаму авалодаць мастацкім словам.

**М. КАМАРОЎСКІ,**
**член літаб'яднання «Росквіт».**

# ПРЫКЛАДНЫ ПЛАН

## ВЫВУЧЭННЯ ПРАМОВЫ ГЕНЕРАЛЬНАГА САКРАТАРА ЦК КПСС ТАВАРЫША Л. І. БРЭЖНЕВА «ЗА СПРАВЯДЛІВЫ, ДЭМАКРАТЫЧНЫ МІР, ЗА БЯСПЕКУ НАРОДАЎ І МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА»

### РЭКАМЕНДУЕЦЦА НАСТУПНЫ ПРЫКЛАДНЫ ПЛАН ПРАВЯДЗЕННЯ ЗАНЯТКАЎ:

**1. Сусветны кангрэс міралюбівых сіл — буйнейшы міжнародны форум змагароў за мір,** які прадстаўляе самыя разнастайныя палітычныя напрамкі. Магутнасць сіл міру, дэмакратыі, свабоды незалежнасці народаў — надзейная аснова барацьбы супраць вайны. Паслядоўная барацьба КПСС і Савецкай дзяржавы за мір, бяспеку народаў і міжнароднае супрацоўніцтва.

**2. Сур'ёзныя поспехі барацьбы народаў за мір і міжнародную бяспеку ў апошнія гады.** Шырокае прызнанне прынцыпаў мірнага суіснавання, паварот ад «халоднай вайны» да разрадкі напружанасці — галоўная тэндэнцыя ў развіцці сучасных міжнародных адносін.

Змяненне суадносін сіл на міжнароднай арэне ў карысць сацыялізму. Роля Савецкага Саюза і краін сацыялістычнай садружнасці ва ўмацаванні міру. Класавы, інтэрнацыяналісцкі змест ленінскай знешняй палітыкі КПСС. Суадносіны сусветнага рэвалюцыйнага працэсу і агульнадэмакратычнай барацьбы за мір.

**3. Далейшае развіццё Праграмы міру, прынятай на XXIV з'ездзе партыі, у прамове тав. Л. І. Брэжнева на Сусветным кангрэсе міралюбівых сіл.** Прынцыповая пазіцыя КПСС і Савецкай дзяржавы па асноўных праблемах сучаснага сусветнага развіцця і далейшай разрадкі міжнароднай напружанасці. Барацьба КПСС за стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе і Азіі, мірнае супрацоўніцтва паміж дзяржавамі, развіццё адносін паміж Савецкім Саюзам і ЗША, спыненне гонкі ўзбраенняў. Намаганні СССР па мірнаму ўрэгуляванню блізка-усходняга крызісу. Варожы справе міру і сацыялізму знешнепалітычны курс пекінскага кіраўніцтва.

**4. Салідарнасць, актыўныя дзеянні ўсіх міралюбівых сіл — магутны фактар умацавання міру.** Рашучае пераадоленне супраціўлення праціўнікаў разрадкі напружанасці, барацьба супраць злавеснага саюза мілітарызму і манаполій — надзённая задача міралюбівых сіл. Выкрыццё варожых сацыялізму прапагандысцкіх кампаній і неабходнасць павышэння рэвалюцыйнай пільнасці. Крызіс буржуазнай дэмакратыі ў капіталістычным грамадстве. Савецкі лад жыцця — найвялікшая заваёва сацыялізму.

Выхаванне працоўных нашай краіны ў духу высокай палітычнай свядомасці, пралетарскага інтэрнацыяналізму і патрыятызму, рэвалюцыйнай пільнасці.

### ЛІТАРАТУРА

**Ленін У. І.** Другі Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Даклад аб міры 26 кастрычніка (8 лістапада). Поўны зб. тв., т. 35, стар. 13—18.

**Ленін У. І.** Праект пастановы ЦК РКП(б) аб задачах савецкай дэлегацыі ў Генуе. Поўны зб. тв., т. 44, стар. 406—408.

**Матэрыялы XXIV з'езда КПСС.** М. Палітвыд., 1971.

**Аб міжнароднай дзейнасці ЦК КПСС па ажыццяўленню рашэнняў XXIV з'езда партыі.** Пастанова Пленума ЦК КПСС, прынятая 27 красавіка 1973 г.

**Брэжнеў Л. І.** За справядлівы, дэмакратычны мір, за бяспеку народаў і міжнароднае супрацоўніцтва. Прамова на Сусветным кангрэсе міралюбівых сіл у Маскве.

**Дакументы Сусветнага кангрэса міралюбівых сіл.** «Праўда», 2 лістапада 1973 г.

**Народам планеты — мір і бяспеку.** «Праўда», 3 лістапада 1973 г.

*Студэнцкія мерыдыяны*

# НЕЗАБЫЎНЫЯ СУСТРЭЧЫ

(Працяг. Пачатак у № 31.).

### КРАКАЎ

Горда і вялікасна ўзвышаецца на Вавелі выдатны каралеўскі замак. Тут была рэзідэнцыя польскіх каралёў нават тады, калі сталіцай Польшчы стала Варшава. Нас здзівіў гэты каралеўскі замак сваёй пышнасцю, багатымі ўборамі сваіх залаў і цікавай архітэктурай. Ён захапіў нас сваёй некранутай бязлітасным часам прыгажосцю.

Каб пабачыць увесь старажытны Кракаў, мы ўзняліся на ўзгорак Тадэуша Касцюшкі. Адсюль. як на далоні, бачны ўвесь горад. Было вельмі цікава разглядаць перад сабою ў наш імклівы дваццаты век, як бы ступіўшага з далёкага-далёкага мінулага, Кракаў — крэпасць. Перад намі стаялі шэрыя гмахі дамоў, узляталі ўверх блішчастыя пад сонцам вострыя пікі касцёлаў, грозныя ў мінулым вежы крэпасцей. І сярод усяго гэтага на высокім узгорку ўзвышаецца граза няскораных і апора багатых — непрыступны і суровы ў мінулым замак каралёў польскіх.

А далёка ўнізе спакойная і вялікасная Вісла. Дзень быў спякотным. Вельмі хацелася пакатацца па Вісле, схавацца ад гарачыні ў цяні загараднага лесу. І вось ужо цеплаход адправіўся ад набярэжнай Кракава. Хутка бетонныя берагі магутнай ракі змяніліся на звычайныя. Ад гэтага Вісла стала яшчэ больш захапляючай і маляўнічай. Паабапал яе цягнуліся пышныя зялёныя дубровы. На непрыступных скалах грозна ўзвышаліся старажытныя княжаскія замкі. Але хутка іх змрочная карціна скончылася. Пачалася захапляючая прагулка. У лесе было цудоўна!

У час прагулкі мы праспявалі нямала песень. На душы было вельмі радасна, калі разам з намі на рускай мове спявалі ўсе замежныя госці і турысты. На ўсё наваколле гучалі такія вядомыя песні, як «Кацюша», «Калінка», «Падмаскоўныя вечары». Нас перапаўняла пачуццё гордасці за сваю любімую Радзіму.

22 ліпеня мы з усім польскім народам адзначалі самы дарагі для яго дзень—Дзень Адраджэння Польшчы. Святочная праграма была багатай. Асабліва вялікае ўражанне зрабілі тэатралізаваныя прадстаўленні на беразе прыгажуні-Віслы. У святле пражэктараў і рознакаляровых успышак маляўнічага салюта свята было па-сапраўднаму захапляючым.

### НОВАЯ ГУТА

Гэта — невялікі горад. Ён славіцца сваім металургічным камбінатам імя У. І. Леніна. Гэты камбінат будаваўся пры дапамозе савецкіх інжынераў і спецыялістаў на працягу 24 гадоў і яшчэ пашырае свае магутнасці. Агляд камбіната мы пачалі з цэха, дзе плавілі чыгун. Нельга перадаць словамі таго ўражання, якое застаецца ў цябе, калі глядзіш, як па жалабах бяжыць расплаўлены метал і як пылаючая лава адрываецца вогненнымі кавалкамі і падае ў велізарны коўш, а ва ўсе бакі разлятаецца безліч асляпляльных іскрынак.

Пабывалі мы і ў іншых цэхах. Усе аперацыі на камбінаце аўтаматызаваны. Яго прадукцыя ідзе ў многія краіны свету. Нам было вельмі прыемна слухаць, калі польскія рабочыя з вялікай цеплынёй гаварылі пра Савецкі Саюз, пра людзей нашай краіны, пра тых, хто дапамагаў будаваць гэтае сучаснае прадпрыемства.

### ОЙЦАЎ

Нямала выдатных мясцін у Польшчы. Усе яны чымсьці знамянітыя, чымсьці выдатныя. Да такіх мясцін належыць і горны Ойцаў.

Дарога ішла сярод невысокіх гор і вапняковых скал, якія пакрыты густым лесам. Мы дабраліся да таго месца, адкуль у нас павінна было пачацца ўзыходжанне да пячоры, у якой хаваўся польскі кароль Лакетка. Крута ўгору вяла сцяжынка. І вось мы ўжо ля пячоры. Нам адкрылі жалезныя вароты. Цёмны, амаль непрыкметны ўваход у далёка вядомую пячору. Тут было холадна і сыра. Мы ішлі са свечкамі, каб асвятляць сабе шлях. Потым праз вузкую адтуліну мы папалі з першага «памяшкання» ў другое. Тут прама ў скале была зроблена ляжанка для караля. Нам было вельмі цікава паглядзець на велізарныя глыбы вапняка, якія пад уздзеяннем прыроды ператварыліся ў гіганцкага арла, раскінуўшага крылы, і ў дзіка.

Тры месяцы хаваўся кароль Лакетка ў гэтай пячоры. А наогул, у гарах Ойцава польскі кароль правёў шэсць гадоў.

І вось зноў мы імчымся ў аўтобусе па маляўнічай горнай мясцовасці. Паабапал дарогі — невысокія горы і бясконцы лес. Здалёку мы ўжо бачылі высока на недаступнай скале княжаскі замак «Пяскава Скала». Высокія тоўстыя сцены крэпасці і грозныя вежы па вуглах надзейна ахоўвалі замак князя ад ворагаў. Сам замак вельмі цікавы архітэктурным вырашэннем пабудовы.

Гэты замак даў нам поўнае ўяўленне пра тое, як жылі польскія князі. Усе, хто наведвае замак, заўсёды кідае ў княжаскі калодзеж манеты, каб калі-небудзь сюды вярнуцца зноў. І мы таксама кінулі манеты.

**Н. ЦЯСЛЕНКА,**
**студэнтка IV курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**(Працяг будзе).**

□

**Падрыхтоўка высокакваліфікаванага спецыяліста цяпер немагчыма без яго актыўнага ўдзелу ў навукова-даследчай рабоце. Толькі творчыя адносіны да вучобы, замацаванне тэарэтычных ведаў на практыцы дазваляюць паспяхова авалодаць самым складаным курсам навукі.**

**На здымку: студэнты чацвёртага курса фізічнага факультэта Анатоль БЕЛАВУСАЎ і Людміла МАРОЗ праводзяць вымярэнне моманту трэння ў залежнасці ад рэжыму змазкі і нагрузкі хуткасці. Даследаванне праводзіцца ў лабараторыі трываласці паверхневага пласта цвёрдага цела.**

Фота А. Рудчанкі.



*ГУМАРЭСКА*



## ЯК Я СТАЎ ЭКС-ЧЭМПІЁНАМ

Чэмпіёнам універсітэта па плаванню я зрабіўся, выйграўшы фінальны заплыў розным стылем на 400 метраў. А вось экс-чэмпіёнам я стаў інакш.

З дому ва ўніверсітэт я езджу на 500-вясёлым аўтобусе. На ім я езджу і з універсітэта дамоў.

У той сонечны дзень мне так і карцела прайсціся пешшу, але я цвёрда вырашыў ехаць. Справа ў тым, што калі я іду пешшу, дык абавязкова п'ю ў кафэ «Вясна» піва і парушаю спартыўны рэжым. А перад фіналам горада я не хацеў выходзіць з формы.

У аўтобусе я ўсеўся і пачаў абдумваць некаторыя пытанні па плаванню, як хтосьці тузануў мяне за рукаў і прамовіў: «Ваш кантрольна-праяздны дакумент прад'явіце, калі ласка, грамадзянін малады чалавек...»

Так я стаў «зайцам».

«Зайцам» быць складаней, чым чэмпіёнам. Праз два дні дэкан Светлы атрымаў паперу наступнага зместу: «Ваш студэнт Такі Гэтакі ехаў без білета ў аўтобусе маршрута № 500-вясёлы, чым парушыў пастанову гарвыканкома ад такой даты гэтага года. Пры затрыманні выказаў незадаволенасць правяраючай асобе і адмовіўся заплаціць штраф у колькасці 50 (пяцідзесяці) капеек, за безбілетны праезд у адпаведнасці з пастановай той жа даты таго ж года. Прашу пакараць і прызваць да парадку, каб у далейшым інцыдэнт не паўтарыўся.

Начальнік ВЯЛІКІ».

Дэкан рассвірыпеў і запытаў: «Чам-му?» Я адказаў, што ў мяне не было палцінніка. Дэкан рассвірыпеў і запытаў яшчэ раз: «Ч-чам-му?!» Я адказаў, што да стыпендыі засталося два дні. Дэкан СВЕТЛЫ рассвірыпеў яшчэ больш і запытаў: «Ч-чам...»

Пасля гэтага дэкан нічога не гаварыў і болей не свірыпеў, а проста перадаў мяне камітэту камсамола.

Назаўтра раніцою ўсіх студэнтаў сустракала маланка: «Наш студэнт ТАКІ ГЭТАКІ катаўся «зайцам» у аўтобусе. Сваімі дрэннымі паводзінамі ён парушыў пастанову гарвыканкома. Не праходзьце міма, таварышы! Асудзіце яго ўчынак!».

Збоку вісела маленькая аб'ява, у якой гаварылася, што сёння ў аўдыторыі 3—6 будзе разглядацца персанальная справа камсамольца ТАКОГА ГЭТАКАГА.

На пасяджэнне камітэта я прыйшоў своечасова. Мяне папрасілі пачакаць паўтары гадзіны, а потым паклікалі. Я ўвайшоў і сустрэўся поглядам з вострымі вачыма нашага факультэцкага сакратара.

— Як ты пасмеў? — ціха запытаўся ён. — Ты ж наша гордасць, ты — чэмпіён універсітэта ў розным плаванні. Ты павінен быць прыкладам для іншых, а ты...»

Я густа пачырванеў і адказаў, што болей не буду.

А пасля гэтага маю справу перадалі на абмеркаванне савету чемпіёнаў. Чэмпіёны выслухалі мяне з абурэннем. Выступіў і старшыня савета таварыш ГЭТЫ САМЫ. Ён сказаў, што яму агідны мой учынак, і што сам ён пасаромеўся б, будучы чэмпіёнам, не браць білет. У заключэнне ён сказаў: «Зайцам» не месца сярод чэмпіёнаў!».

Усе прагаласавалі аднагалосна.

Так я стаў экс-чэмпіёнам універсітэта па плаванню, пачаў піць піва і хадзіць пешшу.

**Студэнт ТАКІ ГЭТАКІ.**
**Запісаў Алег ЦІМАШЭНКА,**
**будучы эканаміст.**

□

**На геалагічным факультэце шмат часу адводзіцца на выкананне практычных заняткаў.**

**Гэты здымак быў зроблены ў чацвёртакурснікаў геафака пры вывучэнні імі мінералаў.**

□



*Кніжная паліца*

## ЦАРСТВА ВЕДАЎ ПА РОДНАЙ МОВЕ

Зусім нядаўна ў выдавецтве БДУ імя У. І. Леніна выйшла кніга «Беларуская мова і мовазнаўства». Вялікае месца ў ёй займаюць працы супрацоўнікаў кафедры рускай і беларускай моў нашага ўніверсітэта. Ёсць і артыкул загадчыка кафедры замежных моў І. М. Акулава.

Гэта кніга з радасцю была сустрэта студэнтамі, усімі тымі, хто цікавіцца роднай мовай, імкнецца павысіць па ёй свае веды.

З 24 артыкулаў, змешчаных у дапаможніку, студэнты любога курса філалагічнага факультэта знойдуць для сябе што-небудзь патрэбнае, каштоўнае.

Кніга пачынаецца ўступным артыкулам прарэктара па вучэбнай рабоце дацэнта Д. А. Лявончанкі і загадчыка кафедры рускай і беларускай моў прафесара У. В. Анічэнкі. Аўтары разглядаюць народную лексіку, як багатую крыніцу папаўнення літаратурнай мовы. Гэта тэма не новая. На першы погляд яна ўжо добра вывучана. Тым не менш вучоныя-філолагі ў яе распрацоўцы ўзнімаюцца на якасна новую вышыню. Іх вывады грунтуюцца на канкрэтных прыкладах, якія ўзяты з матэрыялаў падрыхтаванага і здадзенага імі ў друк «Дыялектнага слоўніка Гомельшчыны». У прыватнасці, адсюль мы даведваемся, што для слова «жанчына» ёсць 137 народных слоў, якія ўжываюцца ў такім жа сэнсе. 75 сінонімаў мае паняцце «біць», 61 — слова «балота», 26 слоў ужываецца для азначэння паняцця «бервяно», 24 — для «адзення».

Вялікую цікавасць выклікае артыкул М. М. Шакуна «Некаторыя асаблівасці функцыянальнага развіцця беларускай літаратурнай мовы ў савецкую эпоху». На фактычным матэрыяле аўтар прасочвае стан роднай мовы ў дакастрычніцкі час, падрабязна спыняецца на яе сучасных функцыянальных асаблівасцях.

Іншыя працы вучоных-філолагаў прысвечаны канкрэтным аспектам роднай мовы, якія разлічаны ў асноўным на студэнтаў, на іх прафесіянальную арыентацыю. Гэта артыкулы У. Л. Беліча «Кітаб 1771 г. — помнік беларускай мовы XVIII ст.», Р. М. Казловай «Дыялектная лексіка ў палескіх раманах І. Мележа», М. М. Корсакавай «Састаўныя мікратапонімы Петрыкаўшчыны», А. А. Станкевіч «Фанетычная трансфармацыя грэка-лацінскай лексікі ў сучаснай беларускай мове» і іншыя.

Асобна мне хочацца спыніцца на артыкуле Л. В. Цэхановіч «Суадносіны ў семантыцы агульных слоў рускай і беларускай моў». Гэта праца насычана лінгвістычнымі тэрмінамі, а таму, каб чытаць яе, добра разабрацца, адчуць усе тонкасці мовы, трэба мець поўную падрыхтоўку. У артыкуле даследуюцца агульныя, пашыраныя ў рускай і беларускай мовах, галоўным чынам шматзначныя словы. Асаблівая ўвага звяртаецца на іх розніцу ў сэнсавым аб'ёме.

У сваім артыкуле Л. В. Цэхановіч аналізуе погляды і прыводзіць шмат выказванняў вядомых рускіх вучоных-лінгвістаў. Гэта праца мае шмат павучальных прыкладаў.

Выкладчыца кафедры рускай і беларускай моў З. А. Ляксуціна ў сваім артыкуле разглядае супярэчлівыя пытанні беларускага правапісу — формаўжывання назоўніка «двор».

Каштоўным з'яўляецца і даследаванне М. Ф. Ханіна «Аб спосабах размежавання сінтаксічных адносін у сучаснай беларускай мове».

У газетным артыкуле цяжка падрабязна расказаць пра вартасці новай кнігі, пра асобныя яе прабелы. У заключэнне хочацца выказаць толькі агульнае ўражанне. Гэта кніга — плён працы многіх аўтараў, якія стаяць на шляху далейшага развіцця беларускага мовазнаўства і ўносяць у гэту справу важкі ўклад.

**К. УСОВІЧ,**
**студэнт IV-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

